*ЛІТАРАТУРА*
1. Special EB 271: Europeans and Nuclear Safety. <http://ec.europa.eu/public_opinion/archives/ebs/ebs_271_en.pdf> – 23.09.09
2. www.unece.org/env/pp/ <http://www.unece.org/env/pp/> – 23.09.09
3. *Назарова, Д.В.* «Феноменология оценки социальных инноваций: основные векторы сравнения» // Социальные проблемы развития белорусского общества в условиях глобализации: сб. ст., подготовл. по итогам Междунар. науч.-практ. конф. 5–6 июня 2006 г. – Минск: «А.Н. Вараксин», 2006.
4. Социальные реформы в Беларуси: социологический анализ [Текст]: монография – Минск: УП «Технопринт», 2004. – 344 с. (Подготовлена Институтом социологии НАН Беларуси).
5. «Рэспубліка». – 2007. – № 194 (4373).
6. Использован Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь <http://www.pravo.by>

*SUMMARY*

*Features of informational support for government decisions in reformation of social policy are revealed. Correct information policy allows maintaining the integrity of society without social upheaval and increased tensions, to effectively achieve a positive perception of these decisions, the adoption and assimilation of them into the everyday practices of people.*

*УДК 316.346.32-057.875*

***Т.М. Шушунова,***

*кандыдат сацыялагічных навук, выкладчык кафедры паліталогіі і права БДПУ*

# СВЯДОМЫ ВЫБАР САМАЗАХАВАЛЬНЫХ ПАВОДЗІН СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ – ВЫХАД НА ПРАКТЫКУ

Сацыялагічнае вывучэнне самазахавальных паводзін студэнцкай моладзі на сённяшні дзень дастаткова актуальная і запатрабаваная галіна даследаванняў. Яна заклікана папоўніць недахоп сістэмных ведаў аб прыродзе дадзенага феномена ў айчыннай сацыялогіі. Менавіта студэнцкая моладзь як сацыяльная група выступае патэнцыяльным носьбітам інтэлектуальнага капіталу краіны, і ў перспектыве павінна будзе займацца высокакваліфікаванай працай у розных галінах навукі, тэхнікі, кіраванні, культуры і г. д. Даследаванні апошніх гадоў былі сфакусіраваны на аналізе біялагічнай складовай дадзенага феномена. Самазахавальныя паводзіны часцей за ўсё разглядаліся як сродак для паспяховай рэалізацыі розных аспектаў здаровага ладу жыцця. У гэтым кантэксце праводзіліся даследаванні негатыўных фактараў, якія ўплываюць на здароўе маладых людзей. Да іх адносяць: псіхасацыяльны стрэс; нерацыянальнае харчаванне; злоўжыванне алкаголем; курэнне; нізкая фізічная актыўнасць; ужыванне наркотыкаў [1 – 2].

На падставе вывучэння кампанентаў сацыяльнага асяроддзя самазахавальных паводзін на прыкладзе студэнтаў мінскіх ВНУ, можна гаварыць аб тым факце, што ідэальная мадэль самазахавальных паводзін дастаткова выразна прадстаўлена ў свядомасці юнакоў і дзяўчат, але існуе ў латэнтнай форме «адкладзенай рэалізацыі» [6]. Дадзеная высноâ спрыяе ажыццяўленню далейшага і глыбейшага аналізу разглядаемага феномена, а таксама выпрацоўкі новых метадалагічных падстаў для далейшага яго вывучэння.

У рэчышчы тэорыі іерархіі патрэбнасцей Абрахама Маслоу і пры дапамозе анамасіялагічнага падыходу да вывучэння заканамернасцей фарміравання індывідуальных паводзін, вызначаны вялікія адрозненні ў мадэлях самазахавальных паводзін, якія выяўляюцца ў наяўнасці або адсутнасці арыентацый на самазахаванне ў біялагічным, псіхалагічным і сацыяльным адносінах. Камбінаторнае спалучэнне названых арыентацый дазваляе вылучыць наступныя ідэальныя сацыятыпы, якія характарызуюць носьбітаў адпаведных мадэлей самазахавальных паводзін:

- Пазітывіст (надае ўвагу самазахаванню ў біялагічных, псіхалагічных і сацыяльных адносінах).
- Рэаліст (арыентаваны на асабістую бяспеку і псіхалагічны камфорт у найбліжэйшым асяроддзі, для гэтага гатовы ахвяраваць грамадска значнымі мэтамі).
- Кар'ерыст (імкнецца да захавання здароўя для паспяховага сацыяльнага прасоўвання, гатовы ахвяраваць інтарэсамі бліжэйшага асяроддзя).
- Грамадскі дзеяч (арыентаваны на паспяховае ўкараненне ў сацыяльную структуру на ўсіх узроўнях нават за кошт ушчамлення першасных патрэбнасцей).
- Канфарміст (імкнецца найлепшым чынам знайсці і рэалізаваць сябе ў малой групе).
- Мараліст (надае павышаную ўвагу грамадскім мэтам, нормам, прыярытэтам).
- Спажывец (арыентаваны на безумоўнае задавальненне першасных патрэбнасцей)
- Негатывіст (супярэчлівы тып, не надае належнай увагі самазахаванню ні ў адным з адносін).

Вылучэнне спецыфічных сацыятыпаў самазахавальных паводзін дае магчымасць не толькі папоўніць інфармацыйную нявызначанасць па групавых асаблівасцях кожнага сацыятыпу, але, што больш важна, дазваляе азначыць накірункі практычнай працы з боку дзяржавы, сям'і, інды-

віда і г. д. у рамках эфектыўнага ажыццяўлення пазітыўных форм самазахавальных паводзін (у дадзеным выпадку студэнцкай моладзі). Намеціць іх, а не сфармуляваць, паколькі, па-першае, дадзеная галіна даследавання занадта цесна сутыкаецца з шэрагам гуманітарных дысцыплін і прафесій, якія ў сілу сваіх прадметных сфер, ужо на дадзеным этапе здольны аказаць садзейнічанне на шляху ўдасканалення практычных рэкамендацый па прыняцці індывідамі пазітыўных форм самазахавальных паводзін. І іх трэба ўлічваць пры распрацоўцы цэласнай сістэмы рэкамендацый. Гэта такія дысцыпліны, як: псіхалогія, сацыяльная псіхалогія, сацыяльная камунікацыя, лінгвістыка, сацыялогія медыцыны (дадзены спіс можа быць у далейшым пашыраны). Па-другое, выразна сфармуляваць правілы ўкаранення пазітыўных самазахавальных форм паводзін нельга яшчэ і таму, што кожны вылучаны накірунак у сабе ўтрымлівае таксама вызначаны набор пытанняў, які патрабуе пераацэньвання, дапрацоўкі або ж проста іншага падыходу ў рашэнні.

На дадзеным этапе пры выпрацоўцы рэкамендацый для студэнцкай моладзі варта адштурхоўвацца ад таго факта, што асноўнай крыніцай атрымання інфармацыі аб здароўі з'яўляюцца сродкі масавай інфармацыі [5]. Асабліва гэта датычыцца маладзёжнай групы. У сілу сваёй групавой асаблівасці маладыя людзі «актыўна выкарыстоўваюць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Інтэрнэт, мабільная сувязь ужо даўно трансфармавалі класічныя спосабы міжасобаснага ўзаемадзеяння, змяніўшы тым самым фармат чалавечых зносін» [5, с. 382]. Тым самым можна ўскласці асноўную частку адказнасці па папулярызацыі і інфармацыйным забеспячэнні самазахавальных паводзін на сродкі масавай інфармацыі ў сілу бясспрэчнай эфектыўнасці апошніх ва ўсім, што датычыцца ўздзеяння на аўдыторыю, а веды аб асаблівасцях падзелу маладых людзей на вызначаныя сацыятыпы павінны спрыяць стварэнню разгалінаванай сеткі камунікатыўнага ўздзеяння. І тут не патрэбны сур'ёзныя праблемы, паколькі, па даных апошніх даследаванняў, людзі пачынаюць цікавіцца інфармацыяй аб тым, як і якімі сродкамі можна палепшыць і захаваць сваё здароўе, а гэта сведчыць аб росце матывацыі да захавання свайго здароўя і занепакоенасці ім.

Актыўнае ўключэнне пазітыўных мадэлей самазахавальных паводзін у працэс сацыялізацыі студэнцкай моладзі звязана з выпрацоўкай мэтанакіраваных спосабаў уздзеяння на фарміраванне ў студэнтаў арыентацыі на самазахаванне ў біялагічных, псіхалагічных і сацыяльных адносінах. Разгледзім спосабы ўздзеяння для кожнай з вылучаных стратэгій.

Для павышэння значнасці біялагічнай складовай самазахавальных паводзін неабходна распрацоўка якаснай сацыяльнай рэкламы. Біялагічна арыентаванымі з'яўляюцца такія сацыятыпы, як «Спажывец», і ў значнай ступені, паколькі ёсць выяўленая пазітыўна біялагічная скіраванасць, – «Кар'ерыст» і «Рэаліст». Дадзеныя групы маладых людзей у той або іншай ступені ўлічваюць у сваіх паводзінах біялагічныя складовыя самазахавальных паводзін, гэта значыць для іх у першую чаргу важным з'яўляецца клопат аб фізіялагічным аспекце здароўя, пазбяганне небяспек, што датычаць захавання цела, жаданне пражыць доўгае жыццё. Таму ў якасці спосабу ўздзеяння на паводзіны маладых людзей вызначаных сацыятыпаў варта вылучыць якасную сацыяльную рэкламу, трансліруемую ў рамках тэлебачання, на рэкламных плакатах горада. Яна мае мэту або ярка ілюстраваць асноўныя моманты пазітыўных адносін да свайго здароўя, або, дзеючы ад адваротнага, паказваць распаўсюджаныя памылкі насельніцтва па дадзеным аспекце свайго жыцця.

Варта адзначыць, што эфектыўнасць сацыяльнай рэкламы залежыць ад пытання якасці рэкламнага прадукту, прапануемага для масавага прагляду ў межах горада. Праца ў гэтым накірунку павінна быць прэрагатывай высокіх прафесіяналаў. Праблема якасці беларускай сацыяльнай рэкламы цесна звязана з яе пазітыўным успрыманнем асноўнай аўдыторыяй і канчатковай выніковасцю. Студэнцкая моладзь з'яўляецца ў большай ступені ўспрымальнай да якасці прапануемага прадукту. У сілу сваёй інфармаванасці аб разнастайных павевах інфармацыйных тэхналогій, якая мае доступ у Інтэрнэт, наведвае разнастайныя мерапрыемствы адукацыйнага плана, якія прапаноўваюць кінатэатры, клубы сталіцы. Дадзеная сацыяльна-дэмаграфічная група мае магчымасць аналізаваць, параўноўваць і на падставе гэтага або ўспрымаць, або адхіляць тое, аб чым хацеў сказаць заказчык або стваральнік сацыяльнай рэкламы. Актуальнасць і наяўнасць пытанняў па дадзеным аспекце дазваляюць адзначыць, што сацыяльная рэклама можа ўздзейнічаць на паводзіны маладых людзей, у якіх моцная біялагічная скіраванасць у самазахавальных паводзінах. Аднак толькі пры ўмове, што выніковы рэкламны прадукт будзе распрацаваны з улікам спецыфікі дадзенай сацыяльнай групы.

З выяўленай псіхалагічнай арыентацыяй у самазахавальных паводзінах вылучаюць такія сацыятыпы, як «Канфарміст», у вызначанай ступені «Актывіст», «Рэаліст». Разглядаемыя групы маладых людзей у большай ступені, чым астатнія, адчуваюць на сабе ўплыў

іншых людзей, змешчаных з імі ў прасторавай блізкасці: сям'я, сябры, асяроддзе. Для іх унутраны свет, адчуванні, пачуццё камфорту, асабістае псіхалагічнае задавальненне з'яўляюцца асноўным крытэрыем адносін да свайго здароўя, якое яны ўспрымаюць як нейкую магчымасць для жаданага ў дадзены момант правядзення часу. Акцэнтуючы ўвагу на студэнцкай моладзі з псіхалагічнай арыентацыяй, можна меркаваць, што ў дадзеным выпадку праца па інфармаванні аб пазітыўных формах самазахавальных паводзін павінна праводзіцца ў рамках маладзёжных аб'яднанняў. Не выключаючы сямейны ўплыў, працу для дадзеных сацыятыпаў павінны весці разнастайныя маладзёжныя, студэнцкія арганізацыі, аб'яднанні, рухі і г. д. Маладзёжныя арганізацыі здольны са свайго боку аказаць належны ўплыў у рашэнні разглядаемай праблемы.

У наш час у рамках універсітэтаў маюць месца дні інфармавання, дзе выкладчыкі ВНУ падаюць студэнтам актуальную інфармацыю па сацыяльна-палітычных, эканамічных, дэмаграфічных і г. д. пытаннях. Асветніцкая мэта дадзеных мерапрыемстваў у рамках ВНУ апраўдвае сябе, паколькі студэнты заўсёды з вялікай увагай слухаюць інфармацыю падобнага кшталту, праяўляюць цікавасць пры разглядзе пытанняў. Што датычыцца самазахавальных паводзін, то пачынаць працу з маладымі людзьмі неабходна з пытанняў санітарнай асветы, з элементарных асноў медыцыны, паступова фарміруючы светапогляд, культуру беражлівых адносін да свайго здароўя. Разам з тым, калі маеш справу са студэнцкай аўдыторыяй, якая спецыфічная па сваёй сутнасці, маладзёжным арганізацыям варта падысці да гэтага пытання вельмі асцярожна і ўдумліва, выбіраць аптымальныя формы падачы інфармацыі. Папярэдне не дрэнна было б высветліць патрэбнасці, інтарэсы, узровень адукаванасці маладых людзей. І толькі на падставе аналізу атрыманых даных ствараць праграмы, што павінны схіліць студэнтаў на алюстраванне пазітыўных форм самазахавальных паводзін.

Не так даўно з мэтай асветы розных пластоў насельніцтва па пытаннях санітарнай культуры паэты і пісьменнікі, нараўне з перадавымі навукоўцамі-медыкамі, актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні масавай санітарна-асветніцкай літаратуры, да санітарнай асветы прыцягвалі вядомых мастакоў, артыстаў. Часы змяніліся, але праблемы засталіся тыя ж. Якія спосабы ўздзеяння на студэнцкую аўдыторыю зараз будуць адабраны маладзёжнымі арганізацыямі як найбольш дзейсныя, пакуль невядома. Але тое, што да дадзенага пытання неабходна падысці гэтак жа шматаспектна, як раней, не выклікае сумненняў.

Да сацыяльнай арыентацыі самазахавальных паводзін адносяць такія сацыятыпы, як «Маралiст» і ў пэўнай ступені «Грамадскі дзеяч», «Кар'ерыст». Здароўе гэтыя маладыя людзі ўспрымаюць па-спажывецку, як сродак дасягнення пастаўленай мэты. Для іх у большай ступені важна прафесійная рэалізацыя, ацэнкі навакольных, яны арыентаваны на кар'ерны рост і актыўную грамадзянскую пазіцыю. Такім чынам, з дадзенымі маладымі людзьмі неабходна весці працу ў рамках дзяржаўных мерапрыемстваў па фарміраванні сацыяльнай згуртаванасці, нацыянальных традыцый, з прывязкай да патрыятычных ідэй. Развіццё арыентацый на самазахаванне ў сацыяльных адносінах таксама звязана з павышэннем увагі агульнарэспубліканскіх, гарадскіх і раённых сродкаў масавай інфармацыі да трансляцыі пазітыўных вобразаў паспяховых прадстаўнікоў студэнцкай моладзі і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у якасці прыкладу для малодшых калег.

Усе вышэйпералічаныя накірункі, у якіх можа здзяйсняцца далейшая праца па эфектыўным укараненні пазітыўных тыпаў самазахавальных паводзін, павінны рэалізоўвацца комплексна. Толькі на гэтай падставе магчыма арганізацыя працы ў накірунку да далейшай аптымізацыі ўмоў, у якіх бы выбар самазахавальных паводзін быў заканамерным следствам сацыялізацыі студэнцкай моладзі.


*Літаратура*

1. *Ивахненко, Г.И.* Здоровье московских студентов: анализ самосохранительного поведения / Г.И. Ивахненко // Социологические исследования. – 2006. –№ 7 . – С. 78–81.
2. *Ивахненко, Г.И.* Повторные исследования самосохранительного поведения московских студентов / Г.И. Ивахненко, Ю.А. Рудковская // Сорокинские чтения. Отечественная социология: обретение будущего через прошлое: тез. докл. 6 Всеросийской науч. конф; отв. ред. Н.А. Степанов. – Ряз.гос. ун-т им. С.А. Есенина. – Рязань, 2008. – С.138–140.
3. Конструктивное информационное поле: инновационная модель / А.И. Шабловский и др. – Минск: ИООО Право и экономика, 2005. – 141с.
4. *Маслоу, А.* Мотивация и личность / А. Маслоу. – 3-е изд. – СПб.: Питер, 2007. – 352 с.
5. Социальные реформы в Беларуси: Социологический анализ / С.А. Шавель и др. – Минск: УП Технопринт, 2004. – 344 с.
6. *Шушунова, Т.Н.* Самосохранительное поведение как осознанное отношение к своему здоровью (на примере столичного студенчества) / Т.Н. Шушунова // Социальный облик современной белорусской молодежи: сб. ст. / Академия управления при Президенте Республики Беларусь; под ред. Е.В. Лебедевой. – Минск, 2008. – С. 85–95.



*Summary*

*In the article concrete recommendations about distribution of self-preservation behavior in students environment on basis of author's technique of its studying based on allocation of certain types of behavior, directed to preservation of health are considered.*